*С. К. Кананoвіч*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ СУЧАСНЫМ МУЗЕЕМ

Праблема культурнай спадчыны разглядаецца навукоўцамі свету пераважна ў аспекце захавання помнікаў мінулага па сродках музеефікацыі ці музейнага захавання. Аднак у сферу культурнай спадчыны трапляюць звычайна асобныя элементы, а не ўвесь культурны пласт мінулага, які адлюстроўвае з’явы і падзеі рэчаіснасці.

Таму зварот да праблемы захавання, трансляцыі і рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музеях Беларусі з’яўляецца актуальным і абгрунтаваным. Пазіцыя дзяржавы ў галіне захавання культурнай спадчыны супадае з агульнасусветнай тэндэнцыяй развіцця міжнародных праграм уключэння традыцыйнай культуры ў больш шырокія стратэгіі развіцця. У сувязі з гэтым дзейнасць айчынных музеяў павінна быць скіравана ў першую чаргу на актуалізацыю культурнай спадчыны.

На працягу ХХ ст. разуменне праблемы паступова трансфармавалася. Усё часцей у навуковым свеце ставіцца акцэнт на тым, што адным з галоўных складнікаў культурнай спадчыны з’яўляюцца спосабы ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Выкарыстанне звестак аб традыцыйных уяўленнях беларусаў аб свеце прыроды, сродках лекавання і законах узаемадзеяння з раслінным светам (рэпрэзентацыя аднаго з элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны – народнай медыцыны) у музеі народнай медыцыны «Бабуліны вышкі» (вёска Стрэльна Іванаўскага раёна) стала найважнейшым кірункам дзейнасці.

Пашырыўшы межы агульнапрынятай ідэі і прызначэння традыцыйнага музея, загадчыца музея Галіна Вайцяшук зрабіла эксперыментальную спробу актуалізацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны сродкамі музеефікацыі – фіксацыі, аднаўлення і рэпрэзентацыі былой рэчаіснасці, навуковага мадэлявання і канструявання.

Па сведчанні носьбітаў традыцыі, захавальнікаў і транслятараў ведаў па народнай медыцыне («зёлачнікаў»), Галіна Вайцяшук, біёлаг па адукацыі, зафіксавала звесткі і прадставіла ў музеі звыш сотні відаў разнастайных лекавых раслін. Акрамя таго, сабраныя ад траўнікаў рэцэпты настояў, адвараў, мазей таксама рэпрэзентаваны ў музеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На музейна-педагагічных занятках з дзецьмі, у час экскурсіі і дэгустацыі напояў з лекавых траў наведвальнікам распавядаюць пра з'яўленне музея, якое было выклікана неабходнасцю захаваць найбагацейшую нематэрыяльную культурную спадчыну Стрэльна і яе ваколіц. Унікальнасць такой спадчыны ў тым, што яна захавала прыклады і адметныя асаблівасці народнай медыцыны Беларусі. У былыя часы гэта мясцовасць славілася бабулькамі-шаптухамі, альбо па-народнаму – «шэптуркамі». Яны лекавалі ўсю акругу загаворамі ды «зёлкамі» (травамі). Па словах дырэктара музея, нават маглі размятымі ў руцэ бярозавымі лісткамі і падарожнікам спыніць кроў, кукурузным пылком «выганялі» камяні з нырак; настойкай каштана пазбаўлялі ад астэахандрозу, адварам валошкі ратавалі страўнік, чыстацелам – скуру, а чорнай рэдзькай з мёдам дапамагалі вылечыцца ад бранхіту.

Зафіксаваныя ў музеі і народныя замовы і малітвы, што перадаваліся з вуснаў у вусны, з фіксацыяй адметнасцей ужывання і фанетычных асаблівасцей маўлення.

Замежныя турысты, якія з цікавасцю наведваюць музей, акрамя іншых якасцей такой музейнай рэпрэзентацыі, адзначаюць таксама яе асаблівыя рэкрэацыйныя якасці – водар траў (128 духмяных «венікаў») і настоеная на іх гарбата ахутваюць, расслабляюць, супакойваюць.

На сённяшні момант у рабоце музея лекавых траў «Бабуліны вышкі» ёсць і нявырашаныя пытанні. Да прыкладу, існуе попыт, асабліва сярод наведвальнікаў з-за мяжы, на набыццё збораў лекавых траў. Як зазначае Галіна Іванаўна, музей мог бы наладзіць у межах развіцця платных паслуг продаж збораў лекавых раслін па прынцыпе работы аптэкі ў вёсцы Рубяжэвічы Стаўбцоўскага раёна. Аднак існуюць пэўныя фінансавыя перашкоды і недахоп тэхнічнага абсталявання. Што, у сваю чаргу, зніжае магчымасці музея наладзіць больш мабільныя сувязі з тымі, хто зацікаўлены ў пошуках аптымальных шляхоў захавання такога элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны, як народная медыцына. У той жа час дадзены музей з'яўляецца адзіным, дзе рэпрэзентуецца дадзенае адгалінаванне медыцынскіх ведаў і ўвогуле прадстаўлена нематэрыяльная культурная спадчына адным з яе элементаў – народнай медыцынай; з гэтай нагоды ён унікальны ў Беларусі.

Разам з тым ёсць яшчэ прыклад музея медыцынскай скіраванасці.

У Гродна захавалася і працягвае дзейнічаць старэйшая аптэка Беларусі. Будынак аптэкі размяшчаецца на галоўнай плошчы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

горада і ўваходзіць у ансамбль гродзенскага езуіцкага манастыра XVIII ст. Сваю аптэку гродзенскія езуіты адкрылі ў 1687 г. Першапачаткова яна абслугоўвала вучняў і выкладчыкаў калегіума (езуіцкай школы) і знаходзілася ў іншым будынку. У 1709 г. быў пабудаваны спецыяльны аднапавярховы будынак аптэкі, дзе маглі абслугоўвацца ўсе жадаючыя. Другі паверх быў дабудаваны ў 1763 г. Пасля ліквідацыі ордэна ў 1773 г. езуіцкую аптэку перадалі заснаванай у горадзе медыцынскай акадэміі, якая была першай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Беларусі. Гэтым часам у аптэцы працаваў са сваімі вучнямі вядомы французскі вучоны-батанік, доктар медыцыны, прафесар Жан-Эмануэль Жылібер.

З 1796 па 1939 г. аптэкай валодалі розныя дзеячы, вядомыя сваёй дабрачыннасцю. Аднак з цягам часу, калі аптэка набыла іншых уласнікаў, дадзены даследчы кірунак з дзейнасці аптэкі быў страчаны. Сваё другое жыццё аптэка атрымала ў 1996 г., калі частку яе памяшканняў узяў у арэнду і аднавіў навукова-вытворчы кааператыў «Біятэст». Сёння ў старажытнай езуіцкай аптэцы дзейнічае адзіная ў краіне аптэка-музей. Тут магчыма не толькі набыць неабходныя лекі, але і наведаць цікавую музейную экспазіцыю, прадстаўлены фрагменты разнастайных аптэчных памяшканняў мінулага: раслінная лабараторыі, гандлёвай залы, якія арганічна злучаюцца з тэматычным паказам гісторыі аптэкі ў вітрынах.

Разнастайны дакументальны матэрыял, калекцыіі посуду, лекаў, абсталявання, у асноўным XIX–XX стст., адлюстроўваюць асноўныя этапы дзейнасці аптэкі, якія непарыўна звязаны з развіццём медыцынскіх і фармацэўтычных ведаў у нашай краіне.

У сувязі з гэтым зазначым, што, не з'яўляючыся адзінай установай, у якой прадстаўлена медыцынская тэматыка, у той жа час музей у в. Стрэльна адзіны, дзе зроблена спроба музеефікаваць унікальны элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны – народную медыцыну. Такім чынам, музей «Бабуліны вышкі», пашырыўшы межы свайго традыцыйнага прызначэння, з'яўляецца на сёння захавальнікам, транслятарам і рэпрэзентатарам нематэрыяльнай культурнай спадчыны, стаўшы складнікам грамадскага працэсу пошуку шляхоў актуалізацыі і зберажэння культурнай спадчыны чалавецтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ